Источник: "Наша слова" - 2015-10-07

# І закрасуе скрозь шыпшына

23 верасня 2015 года Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры сумесна з Цэнтральнай навуковай бібліятэкай імя Якуба Коласа НАН Беларусі зладзілі сумеснае мерапрыемства "І закрасуе скрозь шыпшына...", прымеркаванае да 110 - годдзя з дня нараджэння Пятра Глебкі. Пад час мерапрыемства супрацоўнік бібліятэкі Алесь Сцефановіч прэзентаваў каталог "Бібліятэка" акадэміка П. Ф. Глебкі (1905 - 1969) і прадставіў выста-





ву "І краскі, і словы завіў у вянок ... (па матэрыялах П.Ф. Глебкі)" з уласных фондаў.

Назву імпрэзе, прысвечанай 110 - годдзю з дня нараджэння пісьменніка Пятра Фёдаравіча Глебкі, даў першы паэтычны зборнік пісьменніка "Шыпшына" (1927). Гэта красамоўны ўзор лірычнай паэзіі, дзе вобраз шыпшыны набыў сэнс сімвалу Беларусі, мастацкай эмблемы пісьменніка .

На мерапрыемстве выступалі: Мікола Купава, Эмануім Іофэ, а таксама дачка Глебкі. Было цікава!

*Аляксей Шалахоўскі,*
*гісторык,*
*журналіст.*

Аляксей Шалахоўскі. І закрасуе скрозь шыпшына